літаратура займее масавага чытача. Бо беларуская мова не з'яўляецца носьбітам агрэсіўнага сатанізму, што нясецца на Беларусь, як цунамі.

Моваю XXI ст. на Беларусі будзе, безумоўна, родная. У глабалістычных структурах Еўропы прадугледжана падтрымка беларускай дзяржаўнасці і мовы. Гэта заманліва і для нашых чыноўнікаў, бо заробкі ў еўраструктурах непараўнальныя, а плыні папер значныя. Рускамоўных спецыялістаў там хапае. Акрамя таго, у 2-й палове XX ст. афіцыйны статус набылі – поруч з англійскай! – мовы Уэльса, Шатландыі, Ірландыі, іншых этнасаў і меншасцяў, якія зацікаўленыя ў фінансава-палітычнай падтрымцы.

Падзеі на постсавецкай прасторы, Балканах, у краінах Вялікага Шаўковага шляху сведчаць, што глабалізацыя адбываецца ва ўсіх сферах. Старыя імперыі – Германская, Расейская і нават Брытанская – разбураныя беззваротна. Нават Англія ў Вялікай Брытаніі пацяснілася для Уэльса і Шатландыі. Расея таксама дэзінтэгруецца. Паводле афіцыйных матэрыялаў, значная частка асноўных рэсурсаў РФ належыць замежнаму капіталу. Дзяржаўныя мовы Рэспублікі Саха (Якуція) – якуцкая, англійская і руская. За Уралам не кантралююцца эканоміка і дэмаграфія. На тэрыторыі РФ не спыняюцца ваенныя канфлікты. Адсюль і міжнародны статус Расеі – аслабленая рэгіянальная краіна. Завяршаецца дэзінтэграцыя эканомікі, перш за ўсё на скандынаўска-пецярбургскім і турэцка-маскоўскім кірунку.

Чакаць з Масквы плыні культуры праз рускую мову не выпадае (у адпаведнасці з урадавай праграмай эканамічнага развіцця РФ). Няма ў Расеі магчымасці падвоіць валавы ўнутраны прадукт, каб адносна хутка дагнаць Партугалію, самую адсталую ў Еўропе. А ў Беларусі ёсць рэаліі і перспектыва для культурнага ўздыму. У РФ рубель плануецца зрабіць валютай да 2010 г., уступіць у сусветную гандлёвую арганізацыю і ўзняць цэны на рэсурсы да ўзроўню сусветных. Гэта азначае, што фактар цаны Беларусь страціць, а фактар аддаленасці расейскай прасторы стане рэальным. І толькі настальгія па СССР захавае ў залежнасці ад Масквы невялікую частку беларускіх грамадзян. Але ж і яны не памяняюць сёння "Мерседэс" на "Волгу", а "Фольксваген" на "Масквіч". **Таму глабалізацыя для Беларусі**, у адрозненне ад РФ, **і надалей будзе прагрэсіўным працэсам умацавання дзяржаўнасці, суверэннасці, культурнай самабытнасці.** Але гэта магчыма толькі пры ўмацаванні і ўдасканаленні структур улады і сцвярджэнні прыярытэту беларускай нацыянальнай культуры. Агульначалавечае існуе толькі ў этнічным, калектыўнае – у асобе, глабальнае – у сацыяльна-этнічнай еднасці.

Мова – гэта структура думкі. Ніхто сёння не сумняваецца ў існаванні фізікі тонкіх матэрый і энергетычнага поля Сусвету. У нас выбар: або выпраменьваць жыццёвую энергію, або сілкавацца чужой, г. зн. перастаць быць асобаю.

*Факультатыўныя заняткі*

Алена БАГАМОЛАВА

# ЛЕКСІЧНЫЯ СРОДКІ ЭКСПРЭСІІ Ў МОВЕ МАСТАЦКАГА СТЫЛЮ

## Тлумачальная запіска

Выразнасць маўлення – гэта такая яго камунікацыйная якасць, якая падтрымлівае ўвагу чытача або слухача, прымушае задумацца над зместам твора, кранае думкі і пачуцці і тым самым не пакідае абыякавым. Як вядома, выразнасць ствараецца на ўсіх моўных узроўнях (фанетычным, лексіка-фразеалагічным, граматычным), аднак найбольш разнастайнымі з'яўляюцца лексічныя сродкі экспрэсіі ў мастацкім стылі. Тлумачыцца гэта, на наш погляд, тым, што стыль абслугоўвае эстэтычную сферу жыцця і задавальняе духоўныя патрэбы людзей праз мастацкія вобразы, створаныя з дапамогай тропаў, а таксама сінонімаў, антонімаў, неалагізмаў і іншых сродкаў слоўнай экспрэсіі. Мастацкі стыль, як ніякі іншы, кранае чытача, выклікае адпаведную рэакцыю і, безумоўна, уплывае на фармаванне светапогляду.

Прапанаваная праграма адрасуецца для працы з усімі вучнямі з мэтай узбагаціць веды па названым курсе, пазнаёміць з таямніцамі ўтварэння і функцыянавання слова змястоўнага, экспрэсіўнага, развіць моўна-эстэтычны густ, а таксама навучыць самастойна, удумліва і беражліва, карыстацца словам. Менавіта Яго Вялікасць Слова, выказанае ці напісанае некім, кранае наш розум і пачуцці, а сказанае намі, яно кранае самыя патаемныя думкі і эмоцыі іншых. Такія культурамоўныя, эстэтычныя зносіны ў перыяд "усеагульнага тэставання" асабліва каштоўныя для тых, хто спрабуе свае сілы ў журналістыцы ці ў іншай творчай літаратурнай справе.

Натуральна, што змест і форму правядзення прапанаваных заняткаў можна ўдасканальваць, улічваючы творчы патэнцыял навучэнцаў, іх мастацкія інтарэсы (напрыклад, вучань можа сам прапанаваць аўтара, мову твораў якога ён хацеў бы прааналізаваць).

## ТРОПЫ

### ТЭМА 1. ЭПІТЭТ

Эпітэт у мове мастацкай літаратуры. Граматычнае выражэнне тропа. Тыпы эпітэтаў паводле ўстойлівасці сувязі з паяснёным словам. Функцыя эпітэта ў мастацкім тэксце.

### Заданні

• Прачытайце сказы. Знайдзіце эпітэты, вызначце, якой часцінай мовы яны выражаны.

А там, на радзіме, марозам убраны ў сцюдзёныя зоры стары медны бор (*М. Танк*). Змярцвелы лес будзе стаяць пад суровым небам, успамінаць раздольна-сонечныя вясновыя дзянькі (*Л. Дайнека*). Пахла жывіцай, цягнула настоеным духам лесу (*В. Карамазаў*). Першы баравік, які трапіўся, выклікаў радасць і смех. Буры, здаровы, цвёрды да крамянасці, толькі што ад зямлі, ён холадам нібы апёк пальцы (*І. Пташнікаў*). Вяльможны лес. Дубы-машэкі прыспалі рэха даўніх дзён... (*А. Сыс*). У небе крохкім, жураўліным журботна гукі паплылі (*С. Законнікаў*). Па азызлым, як мёрзлая бульбіна, твары бязвусага і безбародага старога расплылася патайная ядавітая ўсмешка (*Я. Брыль*).

• Прачытайце. Знайдзіце эпітэты і размяркуйце іх паводле ўстойлівасці сувязі з паяснёным назоўнікам.

Васільковы спакой. Смутак верасу сіні. Палыновая памяць смугі (*Р. Барадулін*). Там, дзе арэшнік развесіў гронкі вочак-арэхаў, – заблудзілася ў лесе зялёнае рэха (*К. Кірэенка*). Я думаў – пройдзе ўсё, і ў лютым холадзе ліст абарвецца (*М. Танк*). І разам з ім [хлопчыкам] на пашу выбегла горкая доля (*Я. Брыль*). Грае дудка, вымаўляе, плача дробнаю слязой і ціхутка замірае дзесь у полі за гарой (*Я. Колас*). Праз вокны глядзіць белавокая зіма (*З. Бядуля*). А гром аблачынна-калматы марудна сплывае за лес (*В. Зуёнак*). Ў гора схована ліхое – жыццё бядачае людское (*Я. Колас*). Выпаў снег, замёў прасёлкі – пастараўся студзень-зух (*М. Чарняўскі*). У самотнай цішы перад сном думы думае маці (*Н. Гілевіч*). Мінае, канае часіна ліхая (*Г. Бураўкін*). І ў сэрцы, незакутым у браню, я адчуваю боль нечалавечы (*А. Пысін*). У нас сваіх хапае слоў крамяных, росных, васільковых ад мурагоў і ад лясоў, ад светлых высяў жаўруковых (*Ю. Свірка*).

• Слова *залаты*, як вядома, мае некалькі пераносных значэнняў. Якія з іх яно рэалізуе ў прыведзеных кантэкстах?

З якім значэннем слова *залаты* не будзе выступаць у якасці вобразнага сродку?

У блакітнай высі, цёмна-сінім моры, дагаралі зоры, зоры залатыя (*П. Трус*). Як у лесе зацвіталі ліпы ды каліна, – залатыя сны снавалі мы з табой, дзяўчына (*Я. Купала*). І мнагацветныя акружаць нас вясёлкі, маланкі залатыя замігцяць (*Я. Купала*). Кліча ранак і жней, і сярпы на прастор свой бясконцы жаць прастор залаты – жыта колеру сонца (*А. Куляшоў*). Вучыся ты ў гор задуменна маўчаць, маўчанне ж у іх залатое (*Ю. Свірка*). Хіба выжывем для непаўторнае, новае, залатое пары... (*Я. Янішчыц*). Пад залатымі сонечнымі промнямі не хочацца і птушкам паміраць (*П. Панчанка*). Там вясной шумелі травы, а ў кастрычніку – лісты... Ты смяялася ласкава звонкім смехам залатым (*П. Глебка*). Дзякуй, свацейка! Выручыла ты нас. Сэрца ў цябе залатое (*К. Крапіва*). І добра ўсё ж, што ў часе залатым паверыў я зусім не словам тым, а твайму сэрцу (*К. Цвірка*). Не аднаго мастака ведаю і я. У іх рукі залатыя, вочы бачаць, рукі працу любяць (*Ф. Янкоўскі*). Дзяцінства гады залатыя, маленства ружовыя сны, лятуць, як віхуры ліхія, як дні хуткабежнай вясны!.. (*А. Звонак*).

• Падбярыце да кожнага з прыведзеных слоў эпітэты са словазлучэннямі, вусна складзіце сказы ці тэкст.

Арэлі, дуб, дождж, цішыня, настрой, ластаўкі, паштоўкі.

• Складзіце і запішыце апісанне — партрэт свайго сябра / сяброўкі, падбіраючы эпітэты — характарыстыкі да слоў *вочы, вусны, бровы, нос* і г. д.

• Прачытайце урыўкі з мастацкіх тэкстаў. Выпішыце эпітэты разам з паяснёнымі словамі і паразважайце над іх роляй у кожным канкрэтным выпадку.

1. Неба было чыстае, густое і высокае. Хмары зніклі раптоўна, як і наплылі. Здавалася, не раз'юшаны і напорысты самадур-вецер пагнаў іх у белы свет, а яны апалі тут, над палямі, лугам, дажджавымі струменямі і парай ды сцяклі незлічонымі раўчукамі ў лагчыны, поячы глебу прэснай і свежай спажывай – вільгаццю... (*І. Пташнікаў*).

2. Побач з князем сеў хлопчык – даўгалыгі отрак з цёмнымі жвавымі вачыма на хударлявым твары. Высокі, крыху пукаты лоб, досыць вялікі, але прыгожа выразаны нос, тонкія вусны, уладны, смелы позірк рабілі яго падобным на арляня, якое яшчэ не аперылася, але гатова ўдзяўбсці кожнага, хто працягне па яго руку. Гэта быў княжыч Усяслаў (*В. Іпатава*).

3. Свабодна і лёгка ліюцца ў душу
Мядовыя пахі лугоў і дубровы...
З маленства пад сэрцам цябе я нашу,
Зямлі маёй сціплай гаючае слова
(*С. Законнікаў*).

• Напішыце, выкарыстоўваючы розныя віды эпітэтаў, замалёўку — апісанне любімай пары года.

• Выпішыце з тэкстаў, якія цяпер вывучаеце на ўроках беларускай літаратуры, эпітэты разам з па-

***Алена Міхайлаўна Багамолава*** *— мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1988), аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка (1994). Дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Аўтар манаграфіі "Дэрывацыя і функцыя экспрэсіўных прыметнікаў у мове народна-паэтычных твораў" (2005), шэрагу мовазнаўчых артыкулаў. Даследуе мову мастацкіх твораў.*



яснёнымі словамі. Паразважайце над іх роляй у раскрыцці ідэйна-эмацыйнага зместу.

## ТЭМА 2. ПАРАЎНАННЕ

**Параўнанне як адзін з найбольш ужывальных сродкаў мовы мастацкага стылю. Структурна-граматычныя разнавіднасці тропа. Тыпы параўнанняў паводле ўстойлівасці сувязі кампанентаў. Роля параўнання ў мастацкіх творах.**

### Заданні

• Прачытайце сказы. Знайдзіце параўнальныя звароты, вызначце іх структурна-граматычныя тыпы і спосабы ўвядзення ў тэкст.

Словы матчынай мовы, роем руплівым кружыце... (*У. Карызна*). Ці расказалі дзецям пра буслоў, ці матчыну спявалі калыханку, што сплецена з дзівосных красак-слоў, смугой спавітых, быццам луг уранку (*С. Блатун*). Ляжаць пакошаныя травы, не травы – казачныя сны, не сны, а шолахі дубравы, вясёлкі, галасы вясны (*М. Танк*). Алень ляніва схіліў над беляком галаву, нюхнуў, чмыхнуў у храпы – беляка як ветрам змяло... (*В. Карамазаў*). Пуржыць, паўзе мяцеліца, пялёнкай белай сцелецца (*К. Буйла*). Ляжаць, нібы ў абрусе беленым, лясы, палеткі і лугі (*А. Астрэйка*). Усё агартаў спакойны, стары, як свет, смутак развітання з цяплом, з летам, набліжэння слаты, халадоў (*І. Мележ*). Гайнёю быстраю ляціць за мной мяцеліца сівая (*В. Шніп*). Светка заблішчэла, як злоўленая русалка (*Л. Рублеўская*). Сцежка сама ведае, як ёй ісці, як ёй весціся, яна хісткая і гнуткая і сцелецца пад ногі, быццам нітка чароўнага клубка (*А. Разанаў*).

• Прачытайце. У прыведзеных сказах знайдзіце параўнальныя звароты і акрэсліце іх від паводле ўстойлівасці сувязі кампанентаў. Звярніце ўвагу на частату ўжывання розных злучнікаў, назавіце найбольш прадуктыўныя.

Як помнік лету, за ракой стаялі стройныя стагі (*А. Бачыла*). І плачам бабрамі нярэдка, ля рэчкі суцішваем крок... (*Ю. Свірка*). Заяц сядзеў як нежывы, баяўся паварухнуцца (*В. Карамазаў*). Заблішчала сіняй пражай маладая збажына (*М. Лужанін*). Для мяне ж яна [мова] вечна жывая, як раса, як сляза, як зара (*П. Панчанка*). Над ракой захлынаціся ў ліўнях аеры, ападалі рудым палатном туманы... (*Н. Тарас*). І хадзілі твае словы, як сваты з абрусам, па сядзібах, па дубровах разам з беларусам (*А. Астрэйка*). І травы, нібыта зялёныя хвалі, на міг ускіпелі, заціхлі, сжаўцелі (*В. Шніп*). Марудзіць час, прамень ляны, як кот (*С. Дзяргай*). Празрыстая хмарка, як срэбраны коннік, за сінюю сопку плыве і знікае (*С. Грахоўскі*). І жнівеньскія зоры пахучыя, як дыні, сінія, нібыта верасы (*Г. Бураўкін*). З неба асенняга ноччу неасцярожная зорка, як светлячок, заляціць (*М. Танк*). Далібор як язык праглынуў (*Л. Дайнека*). Пацешныя, як важаняты, дзве маленькія кабеціны ў шэрых шубках тэпалі побач з высозным бацькам (*Я. Брыль*).

• Знайдзіце параўнанні ў паэтычных радках Алеся Разанава. Адзначце элементы гукапісу, якія пацвярджаюць сэнсавую і эмацыйную непаўторнасць тропаў.

Нібы жардзіна рухомага плота, дзіда дзяжурыць то на дзядзінцы, то ў дзікім полі. Павуціна як ціна: хто ў яе трапіць, таго яна аблытвае і палоніць. Кішэня нібы кірмаш. Гліна гнуткая, як галіна, і лінія яе паводзін супадае з лініяй паводзін надвор'я. Каб слаўна плылося чаўну, мусіць быць слаўным вясло: не ломкім, нібы салома, а трывалым і абавязковым, як слова. Страла вострая, як страсць, і той, у каго яна трапляе, выпадае са стромы звыклых радасцяў, страхаў, намераў, але таму, хто моцна трымае яе на напятай цеціве ў сваіх руках, яна, як астранаўт, адкрывае стромкае неба. Стараславянскае млѣко як Мека: усе да яго імкнуцца, усім яно лекі... Балгарскае мляко мляўкае, як летні сон: яно лашчыць язык і паднябенне. Праславянскае melko змялелае, як Няміга. Нямецкае... Milch мілае, нібы малітва маці за сваё немаўляці. Ціхмяная, нібы ягня, багна нікога не палохае, ні на кога не нападае, аднак яе баяцца, як ганьбы, і агінаюць, нібы благое здарэнне.

• Выпішыце з прыведзеных урыўкаў параўнальныя звароты. Якая роля гэтых тропаў у мастацкіх тэкстах увогуле і ў пададзеных сказах у прыватнасці?

1. Жнівень падышоў да сярэдзіны; раніцай на лугу ўжо выпадала густая з начы раса, халодная, аж калола ў ногі. Ночы пачаліся ціхія, вільготныя і цёмныя. У цьмяным, як вокны здалёку ў хаце, дзе гарыць сляпая лямпа, без хмар небе, нізкім, навіслым, як старая дзіравая страха над вялікай пуняй, рэдка і скупа, што праз туман, мігцелі зоркі (*І. Пташнікаў*).

2. Няма раўні маім ранетам, па дрэўцу іх садзіў штогод. Яны ў сярэдзіне ўжо лета салодкія, нібыта мёд. Або антоны наліўныя – для вока радасць і краса! Празрыстыя, нібы шкляныя, яны на яблынях вісяць... З вачэй схаваюцца шпакоўні, і салавей праславіць сад. Як срэбра, заблішчыць чароўна на першых лісціках раса. І на бярозах завушніцы гушкацца будуць, як у сне, каткі з тополь на дол каціцца, калі іх вецярок кране (*А. Астрэйка*).

3. Мы радуемся слову,
Адкрытаму ў народных сховах,
Незацяганаму,
Крамянаму,
Як раніцай трава, непатаптанаму,
Як жарабок, брыкліваму,
Як ястрабок, узлётнаму,
Яшчэ і не крыкліваму,
Яшчэ і не грымотнаму,
Не знаўшаму авацый,
Ні мору,
Ні інфляцый,
Як дар,
Як памятка вякоў,
Яно не хоча быць прыспаным,
Забытым скарбам,
Закапаным (*А. Ставер*).

• Запішыце 5-6 слоў – назваў прадметаў, з'яў з жывой і нежывой прыроды, з якімі вы сутыкаецеся штодзённа. Падумайце, што яны вам нагадваюць, утварыце з імі параўнальныя звароты.

• Апішыце ўласны пакой, выкарыстоўваючы розныя структурныя тыпы параўнання.

*Заданні па тэмах "Метафара", "Перыфраза", "Гіпербала і літота" будуць змешчаны ў наступным нумары часопіса.*